ПРАГРЭСІЎНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ Ў РАЗВІЦЦІ КРЫМІНАЛЬНАГА ПРАВА БЕЛАРУСІ XVI СТ. (ПА СТАТУТУ 1588 ГОДА)

*С.А.Гур'еў, БДУ*

Гісторыя крымінальнага права Беларусі бярэ пачатак са звычаёвага права, якое з сярэдзіны XV ст. замянялася пісаным правам у выглядзе шматлікіх грамат, лістоў, прывілееў, статутаў і інш. Статут 1588 г. замацаваў новы этап у развіцці прававой тэорыі, у тым ліку адносна сістэматызацыі і кадыфікацыі феадальнага крымінальнага права.

Статут 1588 г. з'явіўся самай буйной крыніцай крымінальнага права не толькі на Беларусі. Ён аказаў значны ўплыў на развіццё крымінальнага права ўсёй Еўропы, зразумела, у першую чаргу на суседнія краіны. На той час Статут быў адным з прагрэсіўнейшых актаў заканадаўства, у тым ліку і крымінальнага, фактычна, ён утрымліваў нормы, якія тычыліся ўсіх відаў тагачасных злачынстваў і пакаранняў. Так, калі параўноўваць Статут 1588 г. з такой значнай крыніцай крымінальнага права Еўропы, як Саксонскае Зярцала, то ў апошнім, напрыклад, толькі згадвалася пра неабходную абарону, не давалася вызначэння саўдзельніцтву, у той час, як у Статуце гэтыя інстытуты ўжо былі добра распрацаваны.

Статут змяшчаў новыя для крымінальнага права прынцыпы: роўнасці ўсіх свабодных людзей перад законам, адказнасці толькі ў судовым парадку, індывідуалізацыі пакарання ("нихто иный ни за чый выступ и вчинок не был каран, только каждый сам за свой выступ маеть терпети и каран быти" – р. 1, арт. 18) [1, с. 4]. Самым значным прававым прынцыпам, які знайшоў рэгламентацыю ў Статуце, была прэзумпцыя невінаватасці. Падкрэслівалася, што суд "в речах вонтпливых склоннейший маеть быти ку вызволенью нижли ку каранью" [2, с. 250].

Статут значна гуманізаваў крымінальнае права, нават у параўнанні з заходнееўрапейскімі актамі. Тэрмін турэмнага зняволяння быў невялікі – да 1 года і 6 тыдняў, непаўналетнія падлягалі адказнасці з 16 гадоў (па Статуту 1566 г. – з 14), смяротнае пакаранне не прымянялася да цяжарных жанчын, існавала ўзмоцненая крымінальна-прававая ахова жанчыны. Статут быў адным з першых заканадаўчых актаў Еўропы, крымінальныя нормы якога былі накіраваны на ахову прыроды, падтрыманне і павелічэнне яе рэсурсаў, іх рацыянальнае выкарыстанне [3, с. 241].

Статут вылучаў наўмысныя і ненаўмысныя злачынствы, цяжкія і меней цяжкія. Пры адсутнасці віны крымінальнае пакаранне не прымянялася. Ненаўмысная віна ў шэрагу выпадкаў прадугледжвала толькі маёмасную адказнасць (пакрыццё страт, шкоды). Абавязкова вызначалася прычынная сувязь паміж дзеяннем і яго вынікам. Пры прызначэнні пакарання ўлічвалася псіхічнае становішча асобы. Ад адказнасці вызваляліся "шалёныя і дурні" [4, с. 109]. Вызначаўся таксама тэрмін крымінальнай даўнасці ў 3 гады, па заканчэнні якога асоба не прыцягвалася да адказнасці [5].

Увогуле, нягледзячы на тое, што Статут 1588 г. быў законам феадальнага перыяда, яго нормы змяшчалі прагрэсіўныя палажэнні, многія з якіх апярэджвалі

свой час. Статут аказаў выключны ўплыў на развіццё беларускай дзяржаўнасці і нацыянальнай прававой сістэмы, ён стаў сапраўднай прававой скарбніцай, якая вызначыла асноўныя тэндэнцыі правасвядомасці і правапарадку ў грамадстве на некалькі стагоддзяў наперад. На палажэннях крымінальнага права Статута 1588 г. грунтаваліся ўсе наступныя крымінальныя законы.

Літаратура:


1. Довнар Т.И., Шелкопляс В.А. Уголовное право феодальной Беларуси (XV-XVI вв.) / Учебное пособие. – Мн.: Академия МВД РБ, 1995. – С. 4.
2. Юхо Я.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі / Вучэб. дапам. у 2 ч., Ч. 1, Мн.: РІВШ БДУ, 2000. – С. 250.
3. Баркоў А.У., Грунтоў І.А., Доўнар Т.І. Крымінальнае права Беларусі: (закон, злачынства, адказнасць): Навуч. дапам. / Пад рэд. А.У.Баркова. – Мн.: Завігар, 1997. – С. 241.
4. Довнар Т.И., Юрашевич Н.М. История государства и права Беларуси: учеб. пособие / Мн.: Акад. упр. при Президенте Респ. Беларусь, 2005. – С. 109.
5. Статут Вялікага Княства Літоускага 1588. Тэксты. Дапаведнік. - Мінск. - 1989.